Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №1 (82), 2014

*УДК 821.161.3-4*

# Жанрава-тэматычныя адметнасці эсэістычных твораў А. Бабарэкі і А. Разанава

І.А. БАЖОК

У артыкуле ўпершыню ў беларускім літаратуразнаўстве вызначаюцца жанрава-тэматычныя адметнасці эсэістычных твораў Адама Бабарэкі і Алеся Разанава. Разглядаюцца метады і прыёмы, з дапамогай якіх пісьменнікі розных эпох ствараюць метафізічную эсэістыку. Паказваецца тэматычная блізкасць твораў разглядаемых аўтараў. Вызначаюцца жанравыя рысы ў эсэістычных тэкстах.
**Ключавыя словы**: эсэ, жанр, метафізічны, тэматыка, адметнасці.

In the article for the first time in the Belarusian literary the studies of the genre-themed features essay works of Adam Babareka and Ales Razanay are defined. The methods and techniques to help writers of various epochs create metaphysical essay are discussed. Thematic proximity of the works of the considered authors is shown. Genre features in the essay texts are defined.
**Keywords**: essays, genre, metaphysical, theme, features

У гісторыі беларускай літаратуры творчасць Адама Бабарэкі і Алеся Разанава вылучаецца высокім інтэлектуалізмам. З розніцай амаль у стагоддзе гэтыя асобы стварылі «ўважлівую» літаратуру, якая заснавана як на сусветнай, так і ўласнааўтарскай філасофіі пазнання чалавека і рэчаіснасці. Пісьменнікаў яднае не толькі тэматыка, стыль пісьма, але і індывідуальная манера стварэння тэксту. Такога роду метафізічная літаратура – з’ява рэдкая для нацыянальнага мастацтва слова.

У адным з выступленняў А. Разанаў заўважыў: «Гадзіннікі паэтаў могуць паказваць розны час, і тым не менш, нягледзячы на відавочную рознасць, гэта дакладны час, – і таму кожны з паэтаў мае ўнутранае права меркаваць, што ён ведае, што такое сучаснасць і што ён суадпавядае ёй» [1, с. 53]. А. Бабарэка не стаў такім знакамітым, напрыклад, як Я. Купала, бо яго творы патрабуюць падрыхтаванага, адукаванага чытача. Неабходна адзначыць, што якраз час у творчасці абодвух пісьменнікаў не мае канкрэтнага вызначэння. Сучаснасць, якую апісваюць у сваіх творах А. Бабарэка і А. Разанаў, часава не прымацаваная да канкрэтных дат.

Эсэістыка вядомага літаратурна-грамадскага дзеяча 1920-х–1930-х гадоў Адама Антонавіча Бабарэкі (1899–1937) прадстаўлена філасофскімі творамі. Прычым для ўсіх тэкстаў характэрна навуковасць. Свае ідэі аўтар выказвае з дапамогай складаных высноў, тэзісаў, лагічных ланцужкоў, матэматычных формул, парадыгм, пералічэнняў і да т.п. Шырокаму светапогляду А. Бабарэкі садзейнічала яго адукацыя (Мінская духоўная семінарыя, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт), праца (Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, Інбелкульт) і членства ў арганізацыях («Маладняк», «Узвышша»). А. Бабарэка скончыў універсітэт у 1927 годзе, а арыштаваны быў ужо ў 1930. Па сутнасці, у яго было толькі тры гады свабоднага «свядомага дарослага» жыцця. Асноўная частка эсэістычных твораў напісана ў час ссылкі ў Кіраўскую вобласць, дзе А. Бабарэка працаваў бухгалтарам. Распрацоўваючы метадалагічныя прынцыпы літаратуразнаўства і эстэтыкі, А. Бабарэка звяртаўся да прац Шапенгаўэра, Гегеля, Спінозы і інш.

Іншы лёс у А. Разанава. Шмат часу для творчасці, жыццё за межамі краіны. Ды і трымаецца пісьменнік адасоблена ад існуючых арганізацый. І. Штэйнер піша: «А. Рязанов – отшельник, анахорет в творчестве; не принимая участия в окололитературной тусовке, он практически не даёт интервью и старается не допускать посторонних в творческую лабораторию» [2, с. 10]. А. Разанава называюць паэтам, сам ён свае творы лічыць вершамі, але нельга не ўказаць, што гэта ў першую чаргу эсэістычныя творы, асабліва зномы і вершаказы.

У філасофскім эсэ «Разважанні N-скага» (1926) А. Бабарэка асэнсоўвае праблемы быцця свету. Так, матэрыяльны, духоўны і фармальны пачаткі прадстаўленыя як

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

узаемазалежныя, яны роўныя, але не вечныя: пры знікненні адной формы жыцця іншыя нараджаюць яе. Такі працэс пастаянны і бясконцы. Сам аўтар прапагандуе цаніць сваё жыццё, бо яно можа вырataваць і нарадзіць шмат іншых. А. Бабарэка-эсэіст выступае стваральнікам, творцам, крыніцай жыцця: …*Я павінен цаніць сваё жыцьцё як асобы надзвычайна дорага. Я павінен расцэньваць яго так, што-б за яго тое, што ад мяне возьме пачатак жыцця, жыло ў новай больш дасканалай і высокай форме, чым той, у якой жыву я, што-б яно мела больш радасьці, чым маю я, што-б яно вастрэй, чым я, перажывала і любавалася гэтай радасьцю, памятаючы, колькі яна каштавала пакут і з якіх яна складаецца радасьцей, што вызначылі сабою яго форму жыцьця і яго форму і цану радасьцей і пакут. Гэтым вызначаецца мая дзейнасьць* [3, с. 139]. Па словах пісьменніка, усё ў жыцці залежыць ад умоў, знаходзіцца ў часе і прасторы.

На думку А. Разанава, жыццё праяўляецца ў выпрабаваннях і дзякуючы пэўным сітуацыям адкрываецца чалавек, які ў часава-прасторавым плане шырэйшы за жыццё.

У «Разважаннях» А. Бабарэкі моцна сцвярджаецца я-канцэпцыя, што дае права гаварыць аб эсэістычным характары твора («я хачу», «я – матарыяльная істота», «я павінен», «я жыву», «я знаю» і г.д.). Твор прасякнуты вітальнымі матывамі. Аўтар выступае за жыццё, энергію, дзейнасць, рух. Дарэчы, для пазнання апошняга А. Бабарэка выкарыстоўвае фізічныя формулы. У эсэістычных творах А. Разанава не робіцца акцэнт на аўтарскае «я». Наадварот, аўтар падае канкрэтныя, лагічныя, без права выбару «іншага» тэзісы, якія чытач мусіць прымаць за адзіна правільны.

А. Бабарэка выказвае своеасаблівую, «філалагічную» трактоўку дзейнасці: рух ён бачыць у гаварэнні, гаварыць – значыць адчуваць патрэбу, сігналізаваць дзеянне. «Слова – гэта дзея. Гаварыць – гэта дзейнічаць. Калі чалавек гаворыць, ён дзейнічае. Гэта дзейнічаньне выклікае дзейнічаньне ў вакольнай абстаноўцы. У чалавека насьпела патрэба. Гэта патрэба вымушае яго дзейнічаць, каб яе задаволіць. Пачуцьцё патрэбы мабілізуе ўсе сродкі, якія ёсьць у распараджэнні чалавека, і дзейнічае» [3, с. 141].

Абагульняючы ўласныя выказванні, А. Бабарэка прыходзіць да дзвюх высноў: 1. Светабудова – замкнутая прастора, у якой адбываецца разнастайнае жыццё, а за гэтай прасторай знаходзіцца невядомае. 2. Чалавек – раўназначная і самастойная частка наваколля. А. Разанаў жа ўпэўнены, што «чалавек «далейшы» за жыццё, і не можа ён сцвердзіцца ў ім інакш, як толькі пераадольваючы, пераўзыходзячы яго» [4, с. 46].

Асобная частка філасофскага эсэ «Разважанні N-скага» прысвечана праблеме творчасці (параўн. з эсэ І. Абдзіраловіча «Адвечным шляхам», трэці раздзел якога з'яўляецца выключным прыкладам дасканалага белетрыстычнага эсэ). Гэта тэматычная асаблівасць эсэістыкі пачатку XX стагоддзя ўказвае на неаддзеленасць творчасці ад жыццёвай практыкі. Так, адной з радасцей для А. Бабарэкі разам са свядомасцю (аўтар мае на ўвазе самаідэнтычнасць) і гісторыяй з'яўляецца беларуская паэзія. Літаратурныя творы разглядаюцца А. Бабарэкам не толькі як аб'екты гуманітарнай сферы, але і як творы для паўсядзённага выкарыстання. Паняцці «адчуванні», «пачуцці», «настрой» і «перажыванне» тлумачацца з дапамогай мастацкіх «раскладанняў» слоў, гульнёй з формамі і сэнсамі. Напрыклад: «**Настрой** – гэта тое, што выплывае на строй, або тое, што настроена. Ёсьць строй пэўны. На гэты строй можа што-небудзь находзіць, наплываць. Строй парушаецца. Адгэтуль: настрой» [3, с. 142].

Падобныя дзеянні са словам робіць сучасны пісьменнік А. Разанаў у сваіх вершаказах. Толькі словы, якія бяруцца за ключавыя, у А. Разанава называюць у асноўным прадмет («побытавае», на думку пісьменніка, якраз і ёсць тая сфера, дзе рэалізуецца асоба чалавека), у А. Бабарэкі – абстрактныя паняцці. У сучасніка моўна-літаратурныя эксперыменты прыводзяць да выхаду за межы значэння першаснага слова, у А. Бабарэкі гэтае ж збіраецца з мноства і прыходзіць да слова-арыгінала.

Напрыклад, урывак з вершаказа «Гліна» А. Разанава:

Гліна – нігіль, нішто, але ў боскіх руках яна становіцца геніяльнай [5, с. 3].

Эсэ А. Бабарэкі «Разважанні N-скага» завяршаецца высновамі пра аб'ектыўную і суб'ектыўную рэальнасць, дзе ключавыя пазіцыі займае асоба з яе жыццёвым вопытам, патрэбамі і мэтамі. Філасафема: ««Я» і «мы» – вечныя ворагі», выкарыстаная А. Бабарэкам

РЭПАЗІТОРЫЙ ГУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

у канцы эсэ, з'яўляецца не толькі сэнсававызначальнай для апошняй часткі твора, але і ўказвае на ўсвядомленую суб'ектыўнасць усяго эсэ, сцвярджае грамадзянскую пазіцыю аўтара. У творчасці А. Разанава аб'ектам часцей за ўсё з'яўляецца канкрэтны прадмет (цвік, вежа, печ, пень і інш.), аднак і праз гэта пісьменнік выражае нацыянальнае светабачанне, стварае кантэкст, у якім развіваецца аўтарская ідэя.

Філасофскае эсэ А. Бабарэкі «Разважанні N-скага» – адна з першых спроб рэалізацыі магчымасцей жанра ў беларускай літаратуры. Структура твора вытрымана не зусім лагічна, адсутнічае і адна цэнтральная ідэя, на якую павінен працаваць увесь аргументацыйна-доказны пласт. Падобная рассеенасць думак перашкаджае дасягнуць асноўнай мэты жанра. Аднак, нягледзячы на названыя недахопы, эсэ А. Бабарэкі моцнае па змесце, інтэлектуальнае, навуковае і актуальнае. Вершаказы і зномы А. Разанава можна назваць эсэ ў вершах. Іх медытатыўнасць, лаканічнасць, маналагічнасць і парадаксальнасць з'яўляюцца адзнакамі эсэістычнага жанру.

Філасофскае эсэ «Да «Аб людзях і іх інтар[эсах]» « напісана ў форме ліста паэта да сябра. Твор раскрывае праблему чалавека і рэчаў. Аўтар выступае гуманістам, гаворыць пра неабходнасць увагі да чалавека як асобы, указвае на недахопы ў разуменні сучаснага грамадства. Разглядаемая праблема мае грамадскае значэнне і носіць літаратурны характар (эсэіст спасылаецца на канкрэтных паэтаў, у творчасці якіх прадстаўлены рэчыўны свет і адсутнічаюць вершы пра чалавека). Апошняе вынікае з разваг ад імя «нас» (людзей) і «мяне» (чалавека). Напрыклад: *Але мала гэтага, мы зусім забылі, што ж ывём ня толькі сярод рэчаў, якім стараліся з усіх сіл надаць усе адзнакі ж ывога, але што нас акруж аюць ж ывыя людзі і што гэтыя людзі мысьляць, адчуваюць, што гэтыя людзі разнастайны і цікавы па сваіх індывідуальных, асабовых выраж эньнях і абліччах, цікавы па свайму складу, па сваёй арганізацыі і г. д.* [3, с. 144], – агульна пра праблему. *Я кож ную новую кніж ку, як бога, чакаю і накідаюся на яе, як страшэнна галодны. Я шукаю ў ёй пробліску чалавечага пачуцьця, шукаю слова прывету, слова радасьці, шукаю таго, што дух аж ыўляе, акрыляе і ўзьнімае на сьмелую і вялікую творчасьць, на «дзерзкія» імкненьні* [3, с. 145], – асабістае пачуццё аўтара.

А. Разанаў у сваіх творах праз прадметы пазнае чалавека, сінтэзуючы вопыт папярэднікаў. Метафізічнае апісанне рэчыўнага свету дазваляе пісьменніку ахарактарызаваць не толькі акаляючае жыццё, але і паказаць вытокі чалавечай натуры.

А. Бабарэка не павучае, а робіць тонкі намёк на тое, пра каго варта пісаць. Вельмі моцна, з псіхалагічным уздзеяннем гучаць апошнія радкі эсэ: «Лепш пра гэта пакуль што памаўчы. А вось дай слова таму, хто лічыць сябе сучасным поэтам» [3, с. 146].

Эсэ «[Аб адпаведнасьці зьяў іх значэньню]» складаецца з дзвюх сэнсава-кампазіцыйных частак: разваг аб шматстайнасці чалавецтва, магчымасці пазнання гэтага багацця і ўказання на праблему змагання сучаснай пісьменніку паэзіі. Дзве часткі, розныя па сваім змесце, спалучаючыся ў адным тэксце, утвараюць гарманічнае эсэ. Індывідуальна аўтарская пазіцыя вылучаецца (нараджаецца) шляхам сутыкнення дзвюх ідэй, дзе першая раскрывае другую і наадварот.

Да жанра эсэ блізкі твор пад назвай «[Аб «добрай волі» і «канечнасьці» ў об'ектыўным сьвеце]». А. Бабарэка вядзе філасофскую развагу наконт руху ў жыцці чалавека. Асновай стала побытавая сітуацыя награвання гарбаты: агонь грэе ваду, а затым, закіпеўшы, вада можа патушыць агонь. Такія разважанні маглі б быць простым выкладам думак, калі б не выхад на глабальныя праблемы. Працэс закіпання вады пісьменнік параўноўвае з працэсам мыслення чалавека. Яшчэ мацней гучыць апошняя думка: «Госторыя Беларусі ў выгнаньні ў цяперашні час ня можа быць ні чым іншым, як гісторыяй развіцьця мысьлі» [3, с. 174]. Аўтар усведамляе сябе адной з крыніц гісторыі, яе тварцом. Такім чынам, у творы яскрава выяўлена грамадзянская пазіцыя А. Бабарэкі. Аўтар паказаў цэласнасць жыцця праз сувязь «рэчы – прырода – асоба – грамадства – краіна».

Аналагічны папярэдняму па стуктуры твор «Грыбы і мыслі. З лесу». Асноўную частку займаюць звесткі пра збор грыбоў, назіранні за афарбоўкай грыба, яго формай, ростам. Потым тое ж паўтараецца ў выглядзе філасофскіх абстрактных высноў пра рост, развіццё,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ

форму. Лагічным завяршэннем твору служаць дзве высновы, аддзеленыя структурна ад асноўнага тэксту: «Мудрасьць ў жыцьці. Яе трэба толькі выбраць з жыцьцёвай звычайнасьці. Мудрасьць – гэта выбранае ў жыцьці. Яе трэба ўсьвядоміць» і «Родум можна разглядаць як існае ў жыцьці. Трэба толькі яго зрабіць прадметам мысьлі, яго ўсьвядоміць» [3, с. 175]. Пра цеснае спляценне інтэлектуальнага і фізічнага жыцця піша і А. Разанаў. Рух думкі і жыцця, слова і цела, падобныя да пераходу з адной якасці ў другую, з аднаго вымярэння ў іншае.

Філасофскімі развагамі ў форме эсэ можна назваць такія творы А. Бабарэкі, як «Да спосабаў мысьлі», «Прадметы разгляду», «Аб прычынах», «Сэнс выгн[аньня]». Аднак яны пазбаўлены парадаксальнасці, метафарычнасці і іншых істотных адзнак жанру эсэ.

Такім чынам, эсэістычныя творы А. Бабарэкі і А. Разанава з'яўляюцца прыкладам метафізічнага эсэ, у якім аўтарская ідэя дасягаецца з дапамогай скрупулёзнай працы над словам. Часта выкарыстоўваюцца метады дакладных навук, адпаведная тэрміналогія. Такога тыпу эсэсітыка патрабуе сканцэнтраванага прачытання. Метафізічнае мастацтва з'яўляецца элітарным. Асоба аўтара, узроставая катэгорыя мала ўплывае на змест тэкстаў. А. Разанаў на гэты конт выказвае думку, што «для мастацтва «маладых» не існуе. Як не існуе «сталых» ці «старых». У ім іншае суаднясенне, іншыя катэгорыі – эстэтычныя, а не дэмаграфічныя» [4, с. 43]. Яшчэ адна адзнака медытатыўнай эсэістыкі – самарэфлексійнасць, таму значную частку твораў складаюць тэксты пра разумовую дзейнасць чалавека.

## Літаратура

1. Разанаў, А. З апокрыфа ў канон: гутаркі, выступленні, нататкі / Алесь Разанаў. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2010. – 138 с.

2. Штейнер, И. Криница, из которой пил святой: философия поэзии Алеся Рязанова / И.Ф. Штейнер. – Минск : РИВШ, 2010. – 162 с.

3. Бабарэка, А. Збор твораў у двух тамах. Т. 2. Проза, паэзія, філязофія, публіцыстыка, запісныя кніжкі, дзённікі, лісты. Вільня : Інстытут беларусістыкі, Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства, 2011. – 726 с.

4. Разанаў, А. Сума немагчымасцяў : зномы / Алесь Разанаў. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2009. – 122 с.

5. Разанаў, А. Пчала пачала паломнічаць : вершаказы / Алесь Разанаў. – Мінск : І.П. Логвінаў, 2009. – 132 с.

Гомельский государственный
университет им. Ф. Скорины

Поступила в редакцию 10.12.2013

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ